Сяргей Іванавіч Грахоўскі



(1913-2002)

ПАЭТ, ПРАЗАІК, ПЕРАКЛАДЧЫК, ПУБЛІЦЫСТ, КРЫТЫК

Адзін з тых, чый жыццёвы шлях быў азмрочаны дзесяцігоддзямі сталінскага ГУЛагу. Творчасць гэтага таленавітага паэта, а быў ён найперш паэт, вызначаецца ў беларускай літаратуры незвычайна плённымі і важкімі мастацкімі дасягненнямі ў самых розных жанрах.

- Нарадзіўся 25 верасня 1913 г. ў мястэчку Нобель Пінскага павету Мінскай губерніі (цяпер - Зарэчнянскі раён Ровенскай вобласці, Украіна) у сялянскай сям'і
- У 1914 г. разам з бацькамі пераехаў у мястэчка Глуск на Магілёўшчыне
- У 1930 г. пачаў працаваць рабочым на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце

- У 1931-1932 гг. працаваў карэктарам у Дзяржвыдавецтве БССР у газеце «Чырвоная змена»
- Скончыў газетна-выдавецкае аддзяленне літаратурнага факультэту Мінскага педагагічнага інстытута (1935), працаваў рэдактарам на Беларускім радыё, выкладчыкам літаратуры на рабфаку пры БДУ
- Арыштаваны ў 1936 г. у Мінску. Асуджаны пазасудовым органам НКУС у 1936 г. як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» і за «антысавецкую дзейнасць» да 10 гадоў пазбаўлення волі. Знаходзіўся ва Унжэнскім канцлагеры НКУС Горкаўскай вобласці (ст. Сухабязводная)

- Вызвалены ў 1946 г.
- Пасля вызвалення выкладаў рускую мову і літаратуру ва Урэцкай сярэдняй школе Слуцкага раена (1946-1949)
- У 1947 г. з С. І. Грахоўскага знята судзімасць, але ў 1949 г. ён быў паўторна арыштаваны
- Рэабілітаваны ў 1955 г.
- У 1956 -1973 гг. працаваў на радыё, у часопісах «Бярозка» - загадчык аддзела рэдакцыі (1957-1959), «Вясёлка» (1960-1973); літкансультантам СП БССР (1959-1960)

- У 1973-1974 гг. адказны сакратар Камітэта па дзяржаўных прэміях БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры
- З 1956 г. член СП СССР
- З 1974 г. на пенсіі, актыўна займаўся літаратурнай і грамадскай працай літаральна да апошніх дзён жыцця.




Больш за поўвека актыўна супрацоўнічаў з радыё і тэлебачаннем. У 80-х гадах вёў рэгулярную літаратурна-адукацыйную тэлеперадачу “Літаратурная Беларусь”.

Дэбютаваў вершам у 1926 г., але першы зборнік “Дзень нараджэння” выйшаў у 1958 г. З тае пары выдадзена каля шасцідзесяці кніг С. Грахоўскага – паэзія, проза, публіцыстыка, успаміны, эсэ, пераклады, кнігі для дзяцей.




На сповядзі гавораць толькі праўду. Прыспела пара і паэту Сяргею Грахоўскаму голасна паспавядацца перад сваімі сучаснікамі, расказаць пра пакутныя дзесяцігоддзі сваей маладосці і сталасці, пра трагічныя лёсы сяброў і знаемых-партыйных работнікаў, пісьменнікаў, артыстаў, вучоных і калгаснікаў, знішчаных і замардаваных у пару сталінскіх рэпрэсій.



“…Я пасціў дваццаць гадоў перад споведдзю. Я двойчы прайшоў усе кругі пекла і не зламаўся, не знік на таёжных скрываўленых трасах. Я бачыў усе і ўсе перажыў. Лёс злітаваўся і наканаваў мне жывым выйсці з пекла і стаць Сведкаю на Судзе Гісторыі.”



Першы том выбраных твораў склалі вершы 1929-1977 гг. У іх апавядаецца прыгажосць роднага краю, рамантыка дарог, каханне, баявыя і працоўныя подзвігі савецкіх людзей.




Другі том выбраных твораў склалі вершы 1977-1981 гг., паэмы “Памяць”, “Тры вымярэнні”, “Спаленыя масты” і інш., а таксама паэтычныя пераклады.



Сяргей Грахоўскі даўно вядомы аматарам паэзіі. Паэт-рамантык, паэт-шукальнік заўсёды быў на пярэднім краі падзей. Зборнік склалі яго лепшыя лірычныя творы.








Часам ранні снег кладзецца на скроні і на душу
па віне паклёпніка або зайдросніка.
Непаразуменні прынеслі шмат непрыемнасцей
герою аповеці Аляксею Буевічу. У складаных
абставінах узнікла і загартавалася шчырае і
чыстае каханне да маладой настаўніцы Веры.
Пасля многіх апрабаванняў праўда і людская
дабрата прынеслі шчасце закаханым. Падзеі
аповесці адбываюцца ў першыя пасляваенныя
гады ў далёкім сібірскім сяле і ў Беларусі.



Кніга вядомага беларускага паэта - плён актыўнай творчай працы. Гэта - шчырая размова з Радзімай, з чытачом, з часам. Асобным раздзелам пададзены ў зборніку пераклады з творчай спадчыны А. Пушкіна, С. Нерыс, А. Твардоўскага і многіх іншых майстроў мастацкага слова.




Кніга вяртае чытача ў рамантычную пару юнацтва камсамольцаў 30-х гадоў, у суровы час класавай барацьбы, расказвае пра чыстае і светлае каханне, пра лёсы людзей працы. У кнізе знайшлі месца ўражанні пра першыя дні будаўніцтва Наваполацка і нафтаперапрацоўнага завода, пра нашых сучаснікаў.






Гэта лірычны дзённік нашага напружанага часу, змест якога ўзбагачаны самымі вострымі праблемамі і трывогамі за лёс нашых нашчадкаў. Многія вершы сагрэты элегічным лірызмам, успамінамі рамантычнага юнацтва, чыстага і светлага кахання.




Гэта сваеасаблівы лірічны дзённік роздумаў, хваляванняў, радасцей і трывог апошняй пары. У вершах жыве памяць рамантычнай і суровай маладосці, непарыўная сувязь з зямлёю бацькоў, сцвярджаюцца прынцыпы маральнай годнасці і чысціні, чуцен пульс нашага часу. Паэма “Ростань на світанні ” узнаўляе малавядомую гісторыю адданай і трагічнай дружбы Лесі Украінкі з адным з першых беларускіх марксістаў Сяргеем Мяржынскім, прыезд славутай паэтэсы ў Мінск, яе грамадзянскі і паэтычны подзвіг. Кнігу завяршаюць вершы і мініяцюры пра некаторыя негатыўныя з‘явы у нашым побыце.






У кнізе вершаў С.Грахоўскі верны сваім жыццёвым прынцыпам і перакананням - клопатам за лёс Зямлі і чалавека на ёй. Аўтар улюбёны ў харaство родных прастораў, у сумленных, добрых, шчырых і шчодрых людзей, балюча рэагуе на негатыўныя з’явы ў жыцці, веруе ў справядлівасць, розум і дабро. У кнігу таксама ўвайшлі лепшыя пераклады з класічнай і сучаснай паэзіі.




У аповесці расказваецца пра жыццё Героя Савецкага Саюза Васіля Захаравіча Каржа - партызана часоў грамадзянскай вайны, удзельніка баёў з фашыстамі ў Іспаніі, камандзіра Пінскага партызанскага злучэння ў гады Вялікай Айчыннай вайны.



У яго творчасці цэлы шэраг займае літаратура адной тэмы: перыяд палітычных рэпрэсій, які ён прайшоў з 1936 па 1955 г. - дзевятнаццаць гадоў. Сяргей Грахоўскі лічыў сваім галоўным абавязкам расказаць аб сваім часе, сваіх сучасніках, сябрах, назаўжды пакінутых маладымі.




У дар бібліятэцы Педінстытута,
у якім пасяхова вучыўся і ўсё жыццё
цёпла ўспамінаў аўтар гэтай
кнігі - Сяргей Граховскі.
З пажаданнем поспехаў вашым
навезвальнікам і супрацоўнікам.


Дачка аўтара, перакладчык і
укладальнік.

П. Граховская
XI. 2017г.

У кнігу ўвайшлі тры дакументальных аповесці аўтабіяграфічнага ўтрымання, у якіх аўтар успамінае сваё жыццё ў лагерах і спасылцы ў часы савецкіх рэпрэсій.
У якасці пасляслоўя выкарыстаны аўтарскі верш «Матчыны слёзы», друкуецца на мове арыгіналу.

Гэта аўтабіяграфічнае апавяданне палітычнага вязня сталінскіх лагераў.










Многа і плённа працуе ў беларускай паэзіі Сяргей Грахоўскі. Творчасць паэта адметная тэматычнай шырынёй, разнастайнасцю паэтычных фарбаў, пафасам высокай грамадзянкасці. У гэтай кніжцы сабрана лепшае з напісанага Сяргеем Грахоўскім.






Аповесць расказвае пра першыя гады савецкай улады ў далёкім палескім мястэчку. Яшчэ не сціхла рэха грамадзянскай вайны, у суседніх вёсках лютуюць белыя банды. Галоўная падзея аповесці - прыезд у мястэчка атрада па барацьбе з бандытызмам. Героі аповесці -Алёшка і яго сябры - дапамагаюць чырвонаармейцам высачыць і выкрыць ворагаў. Яны сябруюць з байцамі, мараць аб будучыні. Рамантыкай часу пранізана аповесць пра дзяцінства, загартаванае ў агні грамадзянскай вайны.






Аднатомнік выбраных твораў (1913-2002) склалі лепшыя вершы розных гадоў і дакументальныя аповесці “Зона маўчання”, “З воўчым білетам” і “Такія сінія снягі”, у якіх аўтар праўдзіва расказаў пра доўгія гады свайго зняволення ў сталінскіх лагерах і пра сібірскую высылку. У кнігу ўключаны таксама публіцыстычныя артыкулы паэта, старонкі з дзённікаў і лісты да сяброў-пісьменнікаў і іншых асоб.



Па дакументальнай аповесці пастаўлены спектаклі тэатрамі імя Я. Купалы і Гомельскім абласным драматычным у 1968г.; у 1972 г. створаны аднайменны кінафільм. Аповесць расказвае пра гераічныя падзеі першых дзён савецкай улады на Палессі, барацьбу рудабельскіх партызан з нямецкімі і белапольскімі акупантамі, разгром контррэвалюцыйных банд. У цэнтры аповесці - Аляксандр Салавей, бальшавік, арганізатар партызанскіх атрадаў, таленавіты камандзір Чырвонай Арміі.



Кнігу склалі напісаныя ў апошні час творы, тэматычна блізкія, спавядальна - аўтабіяграфічныя, прасякнутыя клопатам пра перабудову свядомасці і душы чалавека. Яны друкаваліся ў часопісах “Полымя”, “Беларусь”, “Маладосць”, у газеце “Літаратура і мастацтва”.



Сяргей Грахоўскі - паэт арыгінальнага творчага почырку.
Яго паэзія ўвабрала ў сябе найбольш характэрныя прыкметы нашага часу. Рамантыка камсамольскіх 30-х гадоў, гераічныя подзвігі свабоднага народа, маральная чысціня, душэўная дабрата і грамадская сталасць савецкага чалавека - вось асноўны змест многіх вершаў паэта.



Успаміны пра вядомых і дачасна загінуўшых літаратараў змясціліся ў кнізе “Так і было”. Пераклаў на беларускую мову «80 000 кіламетраў пад вадой» Ж. Верна (1937, з Ю. Лявонным), аповесць «Ваенная тайна» А. Гайдара (1936), раман «Крушэнне» Р. Тагора (1958), «Выбраныя вершы і паэмы» А. Блока (1980), кнігу лірыкі М. Дудзіна «Пасля спаткання» (1984), асобныя творы А. Пушкіна, Т. Шаўчэнкі, У. Маякоўскага, Я. Райніса, С. Ясеніна, Л. Украінкі, П. Варанько, М. Забалоцкага, А. Твардоўскага, М. Ціханава, М. Ісакоўскага, Р. Гамзатава, А. Венцловы, Т. Масэнкі, М. Нагнібеды, У. Сасюры, Я. Судрабкална і інш. паэтаў.

Раіса БАРАВІКОВА

«НА ГРУДКУ Ў ГАЛАВАХ ПАСАДЗІЦЕ ШЫПШЫНУ...»

На жаль, не ведаю, ці расце на тым самотным грудку ў галавах шыпшына, але чамусьці адразу згадаўся гэты верш Сяргея Іванавіча Грахоўскага, як толькі наважылася напісаць колькі слоўкаў да яго дзевяностапяцігадовага юбілею, які, як і дзевяностагоддзе, адзначацца будзе без яго. А як бракуе, як не стае сёння мудрага, разважлівага і проста цёплага слова Сяргея Іванавіча, слова — у падтрымку літаратуры, нашай мовы, ды і саміх пісьменнікаў.

Праціналі яе навылёт халады,
Ледзяныя снягі замяталі на кручы,
То цяпла нестава́ла, то чыстай вады,
І з гадамі рабіўся шыпшыннік калючы.

Не хапала заўсёды чагосьці ў жыцці,
Толькі вечна жыла неадольная прага,
Хоць у познюю восень яшчэ расцвісці
На крутым узбярэжжы
крывінкамі ягад...

Паэты з пакалення Сяргея Іванавіча любілі звяртацца да вобраза шыпшыны, міжволі напрошваецца сарвацца з губ радок Уладзіміра Дубоўкі: «О, Беларусь! Мая шыпшына...» Напэўна, у тыя страшныя зімы трыццатых гадоў мінулага стагоддзя падчас лютавання сталінскіх рэпрэсій у сібірскіх снягах неаднойчы згадвалася гэтая такая наша, ледзь не каля кожнага сялянскага падворку ружа — водарная ды агністая. А з Сяргеем Іванавічам Грахоўскім упершыню я сустрэлася ў 1971 годзе на другім паверсе Дома друку, дзе тады размяшчалася выдавецтва «Мастацкая літаратура». Каля яго стаялі яшчэ пісьменнікі, слухалі, як ён расказваў пра творчую паездку ці не ў Свярдлоўскую вобласць. Хто стаяў, ужо не помню, а Сяргей Іванавіч, як быццам гэта было ўчора, у вачах — высокі, статны, з вельмі адметным гучным голасам... Праз сем гадоў я атрымаю ад яго кнігу лірыкі з серыі «Бібліятэка беларускай паэзіі» з вельмі цёплым надпісам. Мяркую, гэтаму надпісу паспрыяла тое, што я жыла ў той час на агульнай кухні з мілай Верай Сапега, якая працавала машыністкай у часопісе «Бярозка» і была зямлячкай Сяргея Іванавіча (нарадзілася і выраслa ў Глуску). І хаця сам Сяргей Іванавіч Грахоўскі нарадзіўся ў вёсцы Нобель былой Мінскай губерні, цяпер гэта Украіна, з Глускам звязаны многія яго гады. Гэтае мястэчка — радзіма яго маці, куды ён пераехаў разам з ёю ў пачатку імперыялістычнай вайны, дзе вучыўся ў сямігодцы, адкуль і пайшоў у вялікае і такое няпростае сваё жыццё. І калі згадваць далей біяграфію Сяргея Іванавіча, дык трэба адзначыць, што напачатку трыццатых гадоў ён працаваў на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце і з'яўляўся членам Бабруйскай філіі БелАППа. Першы свой верш ён надрукаваў у часопісе «Беларускі піянер» у 1926 годзе. Потым друкаваўся ў газетах «Звязда», «Чырвоная змена», у часопісах «Маладняк», «Чырвоная Беларусь», «Беларусь калгасная». У 1935 годзе такі малады, ды ўжо вядомы пісьменнік скончыў Мінскі педагагічны інстытут і пачаў працаваць у рэдакцыі «Чырвонай змены», адкуль перайшоў на Беларускае радыё. Цікава, што ў савецкі час у біяграфічных даведках Сяргея Іванавіча пра яго далейшы працоўны шлях звычайна пісалася: «У гады Вялікай Айчыннай вайны працаваў у тылавым леспрамгасе. Дзесяць пасляваенных гадоў настаўнічаў у школах Беларусі і Новасібірскай вобласці...» І толькі ў канцы васьмідзесятых чытач з біяграфічных аповесцяў-успамінаў Сяргея Іванавіча Грахоўскага мог даведацца, што гэта была за праца «ў тылавым леспрамгасе».



Сяргей Іванавіч Грахоўскі.


Хочацца працытаваць урывак з успамінаў Грахоўскага пра паэта Юрку Лявоннага, з якім яны разам працавалі ў 1935 годзе ў рэдакцыі грамадска-палітычнага вяшчання на Беларускім радыё: «...Беларускія пісьменнікі пачалі знікаць у 1930, 1933, а самая вялікая і бязлітасная «праполка» настала ўвосень 1936 года. У кожным доме да раніцы прыслухоўваліся да стуку, рыпу, гулу машыны, трымалі пакуначкі з бялізнаю ў

Раіса Баравікова піша

“А як бракуе, як не стае сёння мудрага, разважлівага і проста цёплага слова Сяргея Іванавіча, слова - у падтрымку літаратуры , нашай мовы, ды і саміх пісьменнікаў.”

(“Маладосць”, №9, 2008 г.)

ДА ЎСЯГО — КЛОПАТНАЕ СТАЎЛЕННЕ



25 верасня 2013 г. — 100 гадоў з дня нараджэння вядомага беларускага пісьменніка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Сяргея Грахоўскага. Быў ён найперш паэт, але плённа і паспяхова працаваў літаральна ва ўсіх літаратурных жанрах і пакінуў вялікую спадчыну — 60 выдадзеных кніг паэзіі, прозы, перакладаў, дзіцячых твораў, успамінаў, публіцыстыкі. У Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва захоўваецца яго асабісты архіў — гэта накіды, рукапісы незавершаных і нявыдадзеных твораў, дзесяткі радыё- і тэлесцэнарыяў, публіцыстыка, артыкулы, успаміны, эсэ, лісты па самых розных справах — грамадскіх, літаратурных, сяброўскіх, юрыдычных і іншых. Але яго лістоў не так і шмат. Іх ён не захоўваў, пісаў многія дзесяцігоддзі ад рукі, без чарнавікоў і лічыў, што друкаваць лісты на машынцы — неэтычна; выключэннем былі толькі афіцыйныя, у высокія інстанцыі. Яны так і засталіся (а хутчэй — загінулі) у адрасатаў. А вось лістоў да яго захавалася шмат, іх ён збіраў. Але з тых копій яго лістоў я адабрала пару дзесяткаў, якія сведчаць аб шчырай і глыбокай грамадзянскай пазіцыі пісьменніка, аб яго стаўленні да людзей, развагі аб літаратуры, аб адказнасці творцы за сваю працу. Лісты вельмі цікавыя, змястоўныя і так шчыра расказваюць пра нядаўняе мінулае. Спадзяюся, што вам, паважаныя чытачы, будзе цікава пазнаёміцца з імі, тым больш, што эпісталярны жанр фактычна застаўся ў XX стагоддзі.

Председателю Президиума Верховного Совета БССР
члена Союза писателей СССР Граховского Сергея Ивановича

ПРОСЬБА.

Вынужден обратиться к Вам с этой просьбой только из гуманных побуждений. Я глубоко обеспокоен судьбой двух детей. Старшему из них три с половиной года, младшему — пять месяцев. В равной мере меня волнует отчаянное положение их семидесятилетней бабушки Анастасии Викторовны Блохиной, матери прославленного первостроителя Полоцкого нефтегиганта, бригадира, секретаря комсомольского комитета Нефтестроя Петра Блохина. Он скоропостижно скончался в 1962 году. Его именем нефтестроевцы назвали новую улицу Новополоцка. Теперь в городе нефтяников вместе с дочерью живет полуслепая семидесятилетняя мать Блохина.

Осенью 1963 года Полоцкий городской суд дочь Анастасии Никифоровны Блохиной — Надежду Щебетун по статьям 91 ч. 3 и 166 ч. 2 Уголовного кодекса БССР приговорил к 6 годам лишения свободы. Но, в связи с беременностью осужденной, исполнение приговора отсрочено на год.

Уступ і публікацыя дачкі пісьменніка Таццяны Грахоўскай

“У Беларускім дзяржаўным архіве-музее літаратуры і мастацтва захоўваецца яго асабісты архіў - гэта накіды, рукапісы незавершаных і нявыдадзеных твораў, дзесяткі радые - і тэлесцэнарыяў, публіцыстыка, артыкулы, успаміны, эсэ, лісты па самых розных справах.”

(“Полымя”, №9, 2013 г.)



А. Ф. Бярозка, *аспірант Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны*

ЖАНР СПОВЕДЗІ Ў ТВОРЧАСЦІ С. ГРАХОЎСКАГА*

Споведзь — жанр літаратуры, у якім «расповед вядзецца ад першай асобы, прычым апавядальнік (сам аўтар ці яго герой) дапускае чытача ў самыя патаемныя глыбіні ўласнага духоўнага жыцця, імкнучыся зразумець "спрадвечныя ісціны" аб сабе, сваім пакаленні» [1, слупок 320]. Сваю назву споведзь атрымала ад лацінскага слова *confessiones*, якое было запазычана з царкоўнай тэрміналогіі, дзе яно азначала два дзеянні: па-першае, пакаянне чалавека перад Богам, прызнанне сваёй спрадвечнай грахоўнасці; па-другое, удзячнасць грэшніка Богу, які вярнуў яго да праведнага жыцця.

Жанравыя асаблівасці споведзі вылучыць даволі цяжка, што абумоўлена цеснай узаемасувяззю, якая існуе паміж жанрамі аўтабіяграфічнай прозы. Сведчаннем гэтага з'яўляецца наяўнасць агульных прыкмет, уласцівых усім ім без выключэння. Такімі прыкметамі з'яўляюцца: форма аповеду ад першай асобы; установка на сапраўднасць; адсутнасць сюжэтных прыёмаў; аўтарская суб'ектыўнасць у адлюстраванні падзей уласнага жыцця. Тым не менш у структуры і змесце споведзі прысутнічаюць пэўныя спецыфічныя элементы: сканцэнтраванасць аўтара на ўнутраных хваляваннях; уплыў аднайменнага царкоўнага таінства; максімальная ступень шчырасці аўтара; пакаянная танальнасць; пафас самаабвінавачвання. Заснавальнікам літаратурнай споведзі з'яўляецца Аўгусцін Аўрэлій, якому належыць выключная роля ў распрацоўцы жанравага канона. У гісторыі сусветнай літаратуры значны ўклад у скарбніцу спавядальных твораў унеслі Ф. Петрарка («Secretum»), Ж.-Ж. Русо («Споведзь»), А. дэ Мюсе («Споведзь сына стагоддзя»), П. Верлен («Споведзь»), А. Уайльд («Турэмная споведзь»), Л. Талстой («Споведзь»), М. Горкі («Споведзь») і інш.

У беларускай літаратуры жанр споведзі набыў асаблівую папулярнасць у 80—90-я гады XX стагоддзя. Перад пісьменнікамі востра паўстала праблема аднаўлення праўды пра савецкае мінулае, што прывяло да небывалага ўздыму аўтабіяграфічнай прозы ў айчыннай літаратуры. «Узмацненне аўтабіяграфічнай плыні — прыкмета нашага часу, яго спецыфіка» [2, с. 6], — канстатуе В. Стральцова. Апроч ужо традыцыйных аўтабіяграфій, дзённікаў, мемуараў з'явіўся цэлы шэраг мастацкіх твораў, якія былі напісаны ў рэдкім для беларускай літаратуры жанры літаратурнай споведзі.

Гэты жанр пачынае сваё станаўленне ў беларускай літаратуры з так званай турэмнай споведзі, што было абумоўлена настойлівай неабходнасцю захаваць у памяці пакаленняў адну з трагічных старонак айчыннай гісторыі — рэпрэсіі 1930-х гадоў. Сярод цэлага шэрага твораў, што прысвечаны распрацоўцы дадзенай тэмы («У капцюрох ГПУ» Ф. Аляхновіча, «Аповесць для сябе» Б. Мікуліча і інш.), вылучаюцца два тэксты, жанравае вызначэнне якіх вынесена ў загаловак, — «Споведзь» С. Грахоўскага і «Споведзь» Л. Геніюш.


Аднак неабходна адзначыць, што першая спроба споведзі ў беларускай літаратуры была зроблена яшчэ ў 1864 годзе Юзафам Каліноўскім — удзельнікам паўстання 1863 года. Прыгавораны ваенна-палявым судом да расстрэлу (пазней дзякуючы намаганням родных пакаранне было заменена на дзесяць гадоў ссылкі ў Сібір), Ю. Каліноўскі перад смерцю вырашае «пераканаць Мураўёва (кіраўніка царскага войска, якое было накіравана на падаўленне паўстання. — *А. Б.*) у бессэнсоўнасці далейшага тэрору» [3, с. 72]. З гэтай мэтай у мінулым афіцэр царскага войска, а ў будучым а. Рафал піша ў сценах турмы «Споведзь», дзе

* Вучэбныя праграмы для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання з 12-гадовым тэрмінам навучання. Беларуская літаратура : V—X кл., базавы і павышаны ўзроўні : IX—X кл., паглыблены ўзровень : XI—XII кл., базавы і павышаны ўзроўні : XI—XII кл., паглыблены ўзровень / М-ва адук. Рэсп. Беларусь. — Мінск : НІА : Аверсэв, 2007. — С. 87, 133, 178, 198, 290—291, 295.

“Сяргей Грахоўскі здолеў раскрыць новыя грані жанру споведзі, унесці ў яго структуру адметныя рысы. Творы беларускага пісьменніка засведчылі пра ўзбагачэнне жанравай сістэмы нацыянальнай літаратуры.”

Такімі словамі заканчвае свой артыкул А. Ф. Бярозка, аспірант Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны

(“Беларуская мова”, №12, 2007 г.)



УСПАМІНЫ

СЯРГЕЙ ГРАХОЎСКІ І АЛЕСЬ РОЗНА: СЯБРЫ — РАВЕСНІКІ — ПАЭТЫ

Сёлета ў верасні спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння вядомага беларускага пісьменніка Сяргея Грахоўскага (25.09.1913 — 11.12.2002). З вялікай адказнасцю звяртаюся да часопіса «Маладосць» з прапановай успомніць іх шматгадовага, настаяннага аўтара. «Маладосць», як цяпер кажуць, «знакавая» веха ў жыцці пісьменніка. Яго лёс быў падзелены на дзве непадобныя часткі, гэта былі біяграфіі нібыта зусім розных людзей. У сакавіку 1956 года часопіс надрукаваў тры вершы 43-гадовага паэта, у далёкім мінулым літаратара і журналіста, а потым вязня, лесаруба, грузчыка, сталяра і настаўніка. З гэтай публікацыі пачалося новае жыццё Сяргея Іванавіча, фактычна, літаратурны ўзлёт на далейшыя 46 гадоў. Працаваў ён плённа, адказна, таленавіта ва ўсіх літаратурных жанрах, пры жыцці было выдадзена каля 60 кніг. Грахоўскі — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі і іншых літаратурных прэмій, заслужаны работнік культуры БССР.

Я прапаную ўспомніць не толькі пра Сяргея Іванавіча, але і пра яго лепшага сябра Алеся Розну, пра сяброўства рэдкай прыгажосці. Яны равеснікі, і ў Алеся юбілей таксама сёлета. Гэты таленавіты паэт, перакладчык, журналіст, рэдактар не дажыў і да 30 гадоў...

Яны сябравалі са школы. Разам вучыліся ў інстытуце, працавалі ў сталічных выданнях і разам трапілі ў мясарубку 1936 года. Разам былі асуджаны (па адной «справе») і трапілі ў адзін лагер. На пачатку вайны іх разлучылі па розных лагпунктах (лагерны пункт). Гэта загубіла Алеся. Адзін, без надзейнага і больш дужага сябра, ён не здолеў выжыць.

Яны трапілі ў «Зону маўчання» ў 23 гады. Яшчэ не паспелі выдаць і першай кніжкі. Вайна знішчыла нават акадэмічныя архівы, не гаворачы пра асабісты архіў Алеся.

Ён быў карэнным мінчанінам. У гета загінула ўся яго сям'я, згарэла хата.

Усё жыццё бацька бедаваў і помніў пра лепшага сябра. Гэтага чалавека ніхто яму не замяніў, хоць пражыў ён яшчэ 60 гадоў пасля Алеся. Думаю, што інфармацыя пра Розну ў даведніку «Беларускія пісьменнікі» (1994) — заслуга бацькі. Нават у зборнік «Расстраляная літаратура» (з «залатой серыі» выдавецтва «Беларускі кнігазбор») Алесь Розна не трапіў. Мабыць, нічога вартага з яго твораў укладальнікі не знайшлі.

Я сабрала частку напісанага бацькам пра Алеся: дзённікавыя запісы, урывак з аўтабіяграфічнай трылогіі, частку артыкула «Жывуць у памяці маёй», прысвечанага Розне і Юлію Таўбіну. Дарэчы, з трох сяброў ацалеў толькі мой бацька. Юлій быў расстраляны 30 кастрычніка 1937 года, на другі дзень пасля абвяшчэння прыгавору. Змешчаны тут і лісты да Грахоўскага брата і сяброўкі Алеся, факсіміле бацькавых пошукаў у Нацыянальнай бібліятэцы. Ён зрабіў спіс усіх публікацый Алеся 1927—1932 гадоў і перапісаў ад рукі. Не ўсе дакументы маюць пэўныя даты. Але, сабраныя разам яны складаюць моцнае ўражанне пра вернае, светлае, адданае сяброўства, яго цану. Яно захавалася ў памяці і сэрцы «пакінутага друга» на ўсё жыццё.

Верш з дзённікавых запісаў аўтар дапрацаваў у 80-я (праз 40 гадоў!) і ўключыў у свае выданні. Дарэчы, гэта адзін з вершаў, напісаных у няволі па-беларуску. Першая страфа загучала мацней, выразней, больш афарыстычна:

Звалілася бяда, нібыта камень:
Мяне мой друг пакінуў без сяброў,
І мне здалося — белымі вянкамі
Укрылася спакойнае Дняпро.

Колькі болю, гора і адчаю ў гэтых радках. Успомнім іх разам: сяброў — равеснікаў — паэтаў.

97

Маладосць

Прадмова, падрыхтоўка да друку і публікацыя Таццяны Грахоўскай

“Усе жыццё бацька бедаваў і помніў пра лепшага сябра. Гэтага чалавека ніхто яму не замяніў, хоць пражыў ён яшчэ 60 гадоў пасля Алеся Розны. “

(“Маладосць”, №7, 2013 г.)



Член Саюза беларускіх пісьменнікаў (1956). Заслужаны работнік культуры Беларусі (1983). Член грамадскага савета (рады) «Мартыралога Беларусі" - гісторыка-асветнага Таварыства памяці ахвяр сталінізму (1988). Лаўрэат літаратурнай прэміі імя А. Куляшова (1983); Дзяржаўнай прэміі імя Якуба Коласа (1992); медаль Францыска Скарыны (1994). Ганаровы працоўны Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбіната (1986), ганаровы грамадзянін Глускага (1996), пасёлка Акцябрскі (1997).



Да самай смерці жыў у Мінску.

Памёр 11 снежня 2002 года.

Пахаваны на могілках «Усходняе».

Мемарыяльная дошка
паэту і пісьменніку
Сяргею Грахоўскаму адкрыта ў
Мінску.



Памятная дошка ўстаноўлена
на доме № 47
на праспекце Незалежнасці,
у якім пісьменнік пражыў апошнія
44 гады.



У 2003 годзе да 90-годдзя з дня нараджэння
у г.п. Глуск (Магілёўскай вобласці),
на радзіме пісьменніка
ўсталяваная мемарыяльная дошка, яго імем у цэнтры
горада названы бульвар, сярэдняя школа № 1
носіць яго імя.
Ганаровы грамадзянін Глуска з 1995 г.